**УДК 397**

# ПРАВАВОЕ І ЭКАНАМІЧНАЕ СТАНОВІШЧА ЯЎРЭЯЎ УСХОДНЯЙ ВІЦЕБШЧЫНЫ Ў 1920–1930-х гг.

***В. М. ЗАЙЦАВА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*У артыкуле разгледжаны асаблівасці эканамічнага і палітыка-прававога становішча яўрэяў усходняй Віцебшчыны ў 1920-1930-я гады. У гэты перыяд на тэрыторыі рэгіёна, як і на астатняй частцы БССР адбыліся істотныя змены ў грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці. Усё гэта моцна паўплывала на становішча яўрэйскай этнічнай групы. Змены якія закранулі жыццё яўрэйскай супольнасці ў дадзены перыяд заслугоўваюць асобнай увагі для вывучэння.*

На працягу 1920-1930-х гадоў у БССР адбываецца шэраг мерапрыемстваў, якія значна змянілі як эканамічнае становішча ўсёй краіны, так і яе палітычны курс. Варта адзначыць, што прыкладна ў гэты перыяд больш уважліва разглядаюцца пытанні адносна правоў этнічных супольнасцей. Усе гэтыя працэссы мелі свае асаблівасці. Некаторыя з іх, якія датычацца пражывання тут яўрэяў, будуць разгледжаны ў данным артыкуле. Перш за ўсё, увага надаецца эканамічнаму становішчу яўрэйскай супольнасці, а менавіта таму, дзе была задзейнічана значная іх частка. Разам з тым, асобна будзе разгледжана палітыка мясцовых уладаў адносна нацыянальна-культурнага развіцця яўрэйскай супольнасці.

Яшчэ з канца XVII да пачатку XX ст. мяжа яўрэйскай аселасці сур’ёзна абмяжоўвала мабільнасць і стала адной з самых галоўных антыяўрэйскіх мер, якія існавалі ў Расійскай імперыі. У гэты перыяд у заходніх губернях Расійскай імперыі вялікая колькасць яўрэяў канкуравала паміж сабой у адных і тых жа галінах эканомікі, вынікам чаго былі нізкія даходы і беднасць. Асабліва цяжкім было становішча ў беларускіх губернях. Пры Аляксандры II (канец 1850-х – 1860-я гады) магчымасць сяліцца па-за мяжой аселасці была дадзена яўрэям-купцам першай гільдыі, тым, хто меў вышэйшую адукацыю, дыпламаваным рамеснікам і «Мікалаеўскім» салдатам. Аднак колькасць яўрэяў за “мяжой” была нязначнай (у 1897 годзе – толькі шэсць працэнтаў расійскіх яўрэяў жылі па-за мяжой), на традыцыйныя яўрэйскія прафесіі – рамяство і гандаль быў вялікі попыт, а канкурэнцыя была нізкай [1, с. 22].

Першая сусветная і грамадзянская войны, якая рушыла за ёй, разбурылі прамысловасць і шляхі зносін Расіі з іншымі краінамі, звялі на нішто сацыяльна-эканамічную аснову існавання сотняў тысяч яўрэяў, якія займаліся гандлем сельскагаспадарчымі прадуктамі і пасрэдніцтвам паміж горадам і вёскай (у Беларусі доля прадпрымальнікаў-яўрэяў у прыватным гандлі склала 90%). Аднак пасля рэвалюцыі 1917 г. унутраны і знешні гандаль манапалізавала дзяржава, што прывяло да зводу і распаду яўрэйскага мястэчка ў Беларусі. У невялікіх гарадах і мястэчках расло беспрацоўе, і каля паўмільёна яўрэяў у пошуках сродкаў да існавання перамясцілася ў буйныя гарады Беларусі.

Эканамічныя і арганізацыйныя перамены, якія адбыліся ў гады ваеннага камунізму і НЭПа ў гарадах былой «мяжы», у тым ліку ў Віцебску, спрыялі пераўтварэнню рамеснікаў-адзіночак і работнікаў дробных майстэрняў у сацыяльна прылегаваны пласт фабрычных рабочых. Адукаваная частка яўрэйскага насельніцтва папоўніла шэрагі служачых, былых, гэтак жа як і рабочыя, членамі прафсаюзаў і таму займалі параўнальна высокую сацыяльную прыступку ў фармальнай савецкай сацыяльнай іерархіі [2, с.143].

У Бешанковічах акрамя рамесніцкай дзейнасці ў даваенны перыяд яўрэі актыўна займаліся гандлем. 25 ліпеня 1924 г. Бешанковіцкі валвыканкамам устанавіў арэндную плату за ўтрыманне гандлёвых шапікаў, якая складала ад 1,5 да 2 рублёў у месяц за кожную квадратную сажань. Летам-восенню 1924 г. у мястэчку пачалі функцыянаваць шапікі Лейзера Копелевича Хайкина (яго крама знаходзіўся на базарнай плошчы, тут прадаваўся хлеб), Іды Гуткович і Залмана Абрамовіча Шафрова. На працягу 1927 г.у Бешанковічах з'явілася яшчэ некалькі гандлёвых аб’ектаў, якія належалі яўрэям. Так, у лютым 1927 г. б. Соскиной быў здадзены ў арэнду буфет у тэатры «селянін». Лейба Вульфсон асобнага памяшкання не меў, а гандляваў “са століка”. З цягам часу некаторыя шапікі зачыняліся: напрыклад, у 1933 г.згарнулі гандаль Берка Іцкавіч Годгільф, Сымон Завялевіч Фрадкін, Залман Хацкелевіч Галбрайх, Хася Янкелеўна Гільман [4].

Аб тым, што большасць яўрэяў займаюцца гандлем гавораць і ўспаміны іншых жыхароў мястэчак. Напрыклад “*... Яны болі чуць крапчэйшыя, таргавалі. У іх пачці ў каждага лавачка была хоць якой, хоць там мелач якая, хоць там іголкам, хоць якой краскай, хоць чым, ані таргуюць, таргуюць і ўсё... яны рыстаранчыкі свае робілі. Яны там самі і ежу гатовілі. І тады дзе там хто робіць з рускіх, тады іх з рыстарана гэтага кармілі, плацілі ім.*” [7].

Яўрэі, другая па колькасці пасля беларусаў група насельніцтва ў Віцебскім і Полацкім акругах, пражывалі ў асноўным у гарадах і мястэчках, працэнт сапраўды занятых у сельскай гаспадарцы быў невялікі. У адрозненне ад сялян, габрэі на працягу некалькіх стагоддзяў былі занятыя ў сферы свабоднага рынку, і эканамічная дзейнасць многіх з іх ляжала ў зоне падвышанай рызыкі – гандлі і пасярэдніцтве (фактары, адкупшчыкі, арандатары і т.д.). Сфера дзейнасці ў габрэяў не ўспадкоўвалася і кожны чалавек, стаўшы эканамічна самастойным, сам выбіраў сабе занятак" [2, с. 142].

Для таго, каб мець больш паўнамоцтваў для прыцягнення яўрэяў да працы на зямлі было створана Таварыства землеўпарадкавання яўрэйскіх працоўных, арганізацыя (фармальна-грамадская), якая ставіла мэтай прыцягненне савецкіх габрэяў да земляробчай працы [5]. На раннім этапе АЗЕТ быў нацыянальнай яўрэйскай савецкай арганізацыяй не толькі па прызначэнні падтрымкі яўрэйскага земляробства і папулярызацыя працы яўрэяў на зямлі, але і па сваім складзе. Як ужо паказвалася, у шэрагу месцаў Беларусі монанацыянальнымі (яўрэйскімі) былі таварыствы ўзаемадапамогі. Нарэшце, у многіх галінах прамысловасці Рэспублікі працягвалі існаваць "Нацыянальныя сферы": шкляная прамысловасць была ў асноўным польскай, на чыгунцы або на пошце яўрэі фактычна не працавалі (былы дзяржаўны сектар), затое швейная і гарбарная галіны прамысловасці заставаліся ў асноўным яўрэйскімі. Аднак такое размеркаванне роляў супярэчыла асноўным тэндэнцыям савецкай палітыкі, накіраваным на ўніфікацыю грамадскага жыцця [2, с. 138].

Правядзенне калектывізацыі парушыла традыцыйны ўклад жыцця нацыянальных меншасцей БССР. Савецкая ўлада бачыла ў калектывізацыі асноўны сродак пераходу да камуністычнага грамадства вясковага насельніцтва, у якім не павінна было быць месца рэлігіі. Аднак у 1930-я гг., нягледзячы на антырэлігійную прапаганду, рэпрэсіі ў адносінах да актыву абшчын і святароў, рэлігійныя перакананні (вераванні) былі часткай жыцця насельніцтва ў нацыянальных калгасах БССР. Адзначалася значная рэлігійнасць сярод калгаснікаў яўрэйскіх і інтэрнацыянальных калгасаў. У многіх калгасах захоўваліся малельні, калгаснікі не працавалі па суботах і падчас рэлігійных святаў, выраблялі мацу, карысталіся паслугамі рэзніка.

У сферы медыцынскага абслугоўвання насельніцтва Лепеля, яўрэі таксама адыгрывалі не апошнюю ролю. З 16 мая 1905 г. лекарам Лепельскай гарадской бальніцы з’яўляўся Ошер Арон Фроимович Гельфанд, які скончыў Юр’еўскі універсітэт. Меліся ў г. Лепелі і вольнапрактыкуючыя ўрачы (усе яны былі яўрэямі). Так, у 1912 г. зубным лекарам была Хана Гіршеўна Лейтман, дантысткай – Песя Сіманаўна Клібанава, фельчарамі – Шмуйла Гецэвіч Гольман і Шмуйла Рахміелевіч Недлін, павівальнай бабкай – Рейза Гіршеўна Мільман. У 1923 г.загадчыкам Лепельскім урачэбным участкам быў Нафтол (Анатоль) Абрамавіч Віхман таксама ў 1923 г. у гарадской аптэцы працавала Рэвека Майсееўна Фейгельман. Яна нарадзілася ў 1898 г. у Лепелі, у 1917-1921 гг. працавала ў Саратаўскай аптэцы № 6, з 4 верасня 1923 г. па 1 лістапада 1923 г. – у аптэцы пры Лепельскай бальніцы [5, с. 16-24].

Адносна палітычна-прававога статуса, можна казаць наступнае: з 1921 г. у БССР было чатыры дзяржаўныя мовы: беларуская, руская, яўрэйская (ідыш) і польская. Пастановай ЦК КП (б) б ад 15 ліпеня 1924 г. было пацверджана абвешчанае чатырма гадамі раней іх роўнасць. У жніўні 1920 г. пры Цэнтральным Бюро Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі было створана Галоўнае бюро яўрэйскіх секцый, якое прыпыніла сваю дзейнасць у студзені 1930 г. Адказным сакратаром яўрэйскага бюро ЦК КП(б)б, кандыдатам у члены і членам Бюро ЦК Кампартыі Беларусі ў 1925-1930-м гг. быў Абрам Рыгоравіч Бейлін. У ліпені 1924 г. быў заснаваны Яўрэйскі аддзел Інстытута беларускай культуры. У снежні 1928 г.ён быў ператтвораны ў Яўрэйскі сектар Беларускай акадэміі навук. У 1932 г. на базе яўрэйскага сектара БАН ствараецца Інстытут яўрэйскай пралетарскай культуры. У 1935 г. у сістэме беларускай Акадэміі навук быў арганізаваны Інстытут нацыянальных меншасцяў, ліквідаваны ўжо ў наступным годзе [6].

Палітыка беларусізацыі, аснову якой складала ўвядзенне беларускай мовы ва ўсе сферы дзяржаўнага і грамадскага жыцця, уключаючы пераклад працы савецкага і партыйнага апарату, прадугледжвала ўвагу да моў іншых нацыянальных меншасцяў. Ідыш разам з беларускай, рускай і польскай мовамі быў заканадаўча прызнаны раўнапраўным і дзяржаўным і нават з’явіўся на гербе БССР. Аснова нацыянальнай палітыкі. у лістападзе 1925 г. была адноўлена дзейнасць яўрэйскага Нацыянальнага суда (дакладней, суд адкрыўся нанова), прычым у Віцебску адначасова з ім быў створаны латышскі Нацыянальны судовы ўчастак. Пры гэтым з яўрэйскага суда прысуды і рашэнні адпраўляліся ў Віцебскі акруговы суд без перакладу, прама на ідышы. У 1925 г.пры Віцебскай газеце «Зара Захаду» была адкрыта суботняя старонка на ідышы «дэр віцебскер арбетэр». У якасці афіцыйнай мовы ідыш быў уведзены ў прафсаюзах, у якіх яўрэяў была большасць, напрыклад у прафсаюзах швейнікаў у Віцебску і друкароў у Полацку. Да канца 1928 г. на часткі прадпрыемстваў з яўрэйскай большасцю партыйныя ячэйкі працавалі на ідышы (пазней афіцыйнай мовай партыйных мерапрыемстваў стаў беларускі); выкарыстоўваўся ідыш у працы камсамольскіх ячэек, ствараліся піянерскія атрады на ідышы [2, с.134].

Ствараюца месныя саветы. Яўрэйскія Нацыянальныя местачковыя Саветы знаходзіліся ў Стрэшыне, Чашніках, Янавічах, Уздзе, Смалявічах, Карме, Тураве, Нароўлі, Капаткевічах, Уле, Дрысе, Ушачах, Асвеі, Старых Дарогах. Аднак дзейнасць яўрэйскіх саветаў сустракала сур'ёзныя перашкоды. Пра гэта сведчылі паведамленні з месцаў сакратароў і работнікаў яўбюро акруговых камітэтаў. Вось адно з іх: "на агульным сходзе местачковага савета не прысутнічала рускае насельніцтва, а толькі яўрэйскае. Аказалася, што рускае насельніцтва ўвесь час ігнаравала местачковы савет. Райкам выстаўляюць матывамі ігнаравання рускай часткай насельніцтва тое, што старшыня местачковага савета - яўрэй, і таму яны лічаць неабходным вылучыць рускага таварыша старшыні местачковага савета" (з дакладу тав. Рашкеса аб праведзенай працы). А вось іншае сведчанне: "у Полацкай акрузе 44 % беларускіх школ знаходзяцца ва ўласных будынках, яўрэйскія школы ўласных будынкаў не маюць. У акрузе будуецца 11 новых школьных будынкаў, з іх для яўрэйскіх школ ніводнага будынка" [3, с. 89-90].

У канцы 20-х-пачатку 30-х гг. асабліва востра паўстала пытанне барацьбы з антысемітызмам. Так, 15 снежня 1928 года была прынятая спецыяльная дырэктыва Бюро ЦК КП(б)Б па гэтым пытанні. На працягу 1929 г. быў зарэгістраваны шэраг антысеміцкіх акцый, якія сталі прадметам спецыяльнага разбору партыйных органаў [6].

Новая хваля актывізацыі па-за культавай дзейнаці рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей была выклікана падрыхтоўкай і прыняццем Канстытуцый СССР у 1936 г. і БССР у 1937 г., таксама правядзеннем Усесаюзнага перапісу насельніцтва, які праводзіўся з 15.10.1936 па 12.01.1937. У часткі насельніцтва ўзніклі ілюзійныя ўяўленні аб магчымасці ажыццяўлення свабоды сумлення і нават аб вяртанні храмаў веруючым. Падчас правядзення перапісу насельніцтва гэта выявілася ў значна большым, чым разлічвалі ўлады працэнце людзей, якія адважыліся заявіць пра свае рэлігійныя перакананні. Аднак спробы веруючых вярнуць або не дапусціць адчужэння культавых збудаванняў і богаслужбовых рэліквій рэлігійных аб'яднанняў не мелі поспеху і рашуча перарываліся ўладамі. Актывізацыя веруючых справакавала новую хвалю рэпрэсіўных дзеянняў у адносінах да рэлігійнага актыву і святароў з боку партыйна-савецкага кіраўніцтва. У другой палове 1930-х гг. пачаўся рашучы наступ супраць рэлігіі. У выніку рэлігійныя абшчыны нацыянальных меншасцей засталіся без святароў і актыву, што дазволіла цалкам забраць культавую маёмасць (пабудовы) у дзяржаўную ўласнасць. Матэрыяльная база абшчын перастала адпавядаць патрэбам рэлігійнага жыцця. Спробы рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей прыстасавацца да савецкай рэчаіснасці аказаліся безпаспяховымі. Тым не менш, вынікам дзейнасці абшчын нацыянальных меншасцей у БССР трэба лічыць захаванне асноўных рэлігійных традыцый на працягу першых двух дзесяцігоддзяў панавання Савецкай улады [8].

Падводзячы вынік, можна сказаць аб тым, што ў 1920-1930 гг яўрэі як і раней у асноўным займаюцца гандлем і крыху менш іх занята рамесніцкай справай. На пачатку 1920-х гадоў адбываецца актыўная кампанія па прыцягненню яўрэяў да зямельнай працы, у выніку чагу ствараліся адпаведныя структуры. Адносна палітыка-прававога становішча можна выдзеліць наступнае: савецкая ўлада на працягу 1920-х гадоў актыўна карыстаецца тэндэнцыяй на прадастаўленне нацыянальна-культурнай аўтаноміі нацыянальным меншасцям. Але нацыянальная палітыка насіла ў большасці сваёй несістэмны характар, што больш адметна к канцу 1930-х гадоў.

ЛИТЕРАТУРА


1. Евреи пограничья: Смоленщина / редкол.: С. Амосова [и др.]. – Москва, 2018. – 336 с.
2. Зельцер, А. Евреи советской провинции: Витебск и местечки 1917- 1941. / А. Зельцер. – М: "Российская политическая энциклопедия" (Росспэн), 2006. – 478 с.
3. Иоффе, Э. Г. Страницы истории евреев Беларуси. / Э. Г. Иоффе. – Минск: ПКФ «АРТИ-ФЕКС», 1996. – 292 с.
4. Карпекин, К. Бешенковичи - исторический очерк / К. Карпекин [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://mishpoha.org/arkhivarius/455-beshenkovichi-istoricheskij-ocherk . – Дата доступа: 25.04.2023.
5. Лепель: память о еврейском местечке / редкол.: С. Амосова [и др.]. – Москва, 2015. – 496 с.
6. Мазец, В. Евреи Советской Белоруссии в межвоенный период / В. Мазец, Э. Иоффе [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://jewishfreedom.org/page674.html . – Дата доступа: 06.05.2023.
7. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача.– Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 2. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – 368 с.
8. Пушкін, І. А. Рэлігійныя абшчыны нацыянальных меншасцей ў перыяд станаўлення і развіцця БССР (1920–1930-я гг.) / І. А. Пушкін [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://docviewer.yandex.by/view/1012575971 . – Дата доступа: 25.04.202
9. Электронная еврейская энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://eleven.co.il/jews-of-russia/history-in-ussr/13053/ . – Дата доступа: 09.05.2023